# СЯРЭДНЕВЯКОВАЯ АРХЕАЛОГІЯ

Дзяніс Дук

## ДА ВЫНІКАЎ АРХЕАЛАГІЧНЫХ РАСКОПАК НА ЗАПАЛОЦКІМ ПАСАДЗЕ СТАРАЖЫТНАГА ПОЛАЦКА Ў 2004 г.

У маі-ліпені 2004 г. праводзіліся археалагічныя раскопкі на тэрыторыі старажытнага Запалоцкага пасада горада Полацка. Раскопкі ажыццяўляліся сіламі навучэнцаў Полацкай нацыянальнай гімпазіі і студэнтамі-гісторыкамі I–IV курсаў Полацкага дзяржаўнага універсітэта. Археалагічныя раскопкі ў Запалоцці (сучасны раён Полацка) археалагічным атрадам ПДУ праводзіліся ўпершыню (за выключэннем шурфоўкі ў 2003 г.). Прычынай гэтаму сталі вынікі праведзенай у маі 2004 г. археалагічнай разведкі, падчас якой быў адкрыты цікавы археалагічны помнік.

У параўнанні з Вялікім пасадам і Верхнім замкам, Запалоцкі пасад археалагічна вывучаны адносна слаба – пераважна ў межах сучаснай грамадзянскай забудовы. Археалагічная разведка па-за межамі сучаснага Запалоцця была праведзена С.В. Тарасавым у 1986–1987 гг.

У 1986 г. за 60 м ад паўночна-заходняй ускраіны Запалоцця (мал. 1) С.В. Тарасавым быў закладзены шурф, у якім была вызначана наяўнасць культурнага пласта 0,8–1,0 м «з высокай насычанасцю матэрыяламі часоў Полацкай зямлі і амаль поўнай адсутнасцю больш позніх матэрыялаў» (Тарасаў, 1998, с. 28). Ва ўрочышчы Капанка за 500–600 м на паўночны захад ад Запалоцкага пасада С.В. Тарасаў лакалізаваў рэшткі паселішча на пляцоўцы памерамі 100×200 м. Культурны пласт паселішча складаў каля 0,2–0,4 м, выяўлены знаходкі XI–XII стст. Даследчык прыйшоў да высновы аб наяўнасці тут паселішча-спадарожніка (сельскагаспадарчага прадмесця горада), часткова пашкоджанага кар'ерам (Памяць, 2002, с. 48; Тарасаў, 1998, с. 94).

Сапраўды, кар'ерам у 1972 г. была знішчана частка паселішча, але культурны пласт захаваўся ў пераадкладзеным выглядзе. Па ўсёй верагоднасці, пласт быў вялікай магутнасці і не падыходзіў для будаўнічых патрэб. Яго перамясцілі на поўдзень ад кар'ера бульдозерам, пасля чаго ўтварыўся штучны пагорак вышынёй 2,5–3 м, на месцы якога намі быў закладзены шурф 4 (2×2 м). Магутнасць пераадкладзенага культурнага пласта тут складала 2,5 м (усяго – 3 м), пласт утрымліваў матэрыялы XI–XVIII стст. з перавагай рэчаў XI–XIII стст. Па сведчанні мясцовых жыхароў, гэты культурны пласт паходзіў з высокага пагорка (мясцовая назва «Гара»), які быў цалкам разабраны для патрэбаў будаўніцтва мікрараёна Полацка па вуліцы Марыненка.

Не выключана, што гэтая «Гара» з магутным культурным пластом магла адыгрываць ролю гарадзішча на заходняй ускраіне старажытнага Полацка. Захаванасць культурнага пласта прадстаўляе патэнцыяльную магчымасць археалагічнага вызначэння храналогіі і асартыменту рэчаў, сацыяльнага статуса і заняткаў насельніцтва.

Археалагічныя раскопкі 2004 г. паказалі, што паселішча, адкрытае С.В. Тарасавым у 1987 г., з'яўлялася паўночна-заходняй ускраінай старажытнага Запалоцкага пасаду. Сам Запалоцкі пасад у старажытнасці быў удвая большы за сучасны (сёння заходняя мяжа Запалоцця з прыватнай забудовай праходзіць па вуліцы Гастэла). Старажытнае Запалоцце размяшчалася на правым беразе Дзвіны ад вусця Палаты да так званага ўрочышча Капанка, гэта значыць за 600 м на захад ад вуліцы Гастэла. Пасад уключаў у сябе частку былога кар'ера разам з «паселішчам», адкрытым раней (мал. 1).

Помнік, на якім праводзіліся раскопкі, размешчаны на высокім правым беразе Дзвіны і ўяўляе сабой роўную пляцоўку, памерамі прыкладна 600×350 м, засеяную кармавымі травамі. Гэтая тэрыторыя мае роўную паверхню, па ёй на адлегласці 50–100 м ад Дзвіны пракладзена меліярацыйная траншэя. У заходняй частцы траншэя злучана з прыродным ровам, які размешчаны перпендыкулярна Дзвіне (мал. 1). Візуальна культурны пласт не фіксуецца, паколькі тут ён прадстаўлены аднароднай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

светла-шэрай зярністай супессю жоўтаватага адцення. З захаду натуральнымі межамі археалагічнага помніка з'яўляецца глыбокі роў, з усходу – шчыльная забудова сучаснага Запалоцця, з поўначы мяжа невыразная, яна была вызначана толькі шляхам правядзення шурфоўкі.

З мэтаю высвятлення плошчы распаўсюджвання і інтэнсіўнасці культурнага пласта з матэрыяламі часоў Полацкай зямлі намі было закладзена 8 шурфоў (мал. 1). Шурфы *1–3* размешчаны прыкладна па адной лініі ўздоўж Дзвіны на аддаленасці каля 30 м ад яе. Шурфы зроблены на адлегласці ў 500 м ад сучаснай мяжы Запалоцця, што адпавядае лініі размяшчэння меліярацыйнай траншэі і першага рова (мал. 1). Другі роў знаходзіцца на адлегласці 150 м ад першага, на захад ад яго характар мясцовасці мяняецца, яна становіцца пагоркавай, культурны пласт на ёй адсутнічае.

Шурфы 1–3 паказалі, што на рознай адлегласці ад заходняй мяжы сучаснага Запалоцця культурны пласт мае аднолькавую структуру. Яго магутнасць у сярэднім 0,8–1 м, месцамі да 1,4 м. Пласт складаецца з трох стратыграфічных гарызонтаў. Верхні гарызонт – баластны, практычна сцерыльны пласт на глыбіню ворыва 0,3 м. Сярэдні стратыграфічны гарызонт мае магутнасць каля 0,3–0,4 м, ён шэры ці бліжэй да цёмна-шэрага, камкаваты, з лінзамі вугалю, вапны, камянямі і рэштkамі драўляных канструкцый, ніжні – зярністы, перадмацерыковы пласт жоўтага ці светла-карычневага колеру магутнасцю 0,2–0,3 м.

Шурфы *5–8* маркіруюць паўночныя межы пляцоўкі. Яны размешчаны па адной лініі ад паўночна-заходняй ускраіны сучаснага Запалоцця да былога кар'ера ўздоўж Дзвіны на адлегласці каля 350 м ад яе. Характар культурных напластаванняў у іх розніцца толькі магутнасцю (каля 0,6 м), стратыграфія і структура пласта аналагічная шурфам *1–3*.

Раскоп 1 разбіты на заходняй ускраіне тэрыторыі распаўсюджвання культурнага пласта на адлегласці каля 550 м ад забудовы Запалоцця побач з ровам 1.

Мэта раскопак – вызначэнне месца паселення ў тапаграфічнай структуры старажытнага Полацка, працягласці яго існавання, характару забудовы і этапаў развіцця.

Раскоп 1 меў памеры 10×14 м і арыентаваны па баках свету. Магутнасць культурнага пласта ад 0,7 да 1,3 м. Характар і напаўненне аналагічнае пласту шурфоў *1–3*. Асноўная колькасць знаходак паходзіла з другога стратыграфічнага гарызонта.

У сярэднім стратыграфічным пласце раскопа 1 даследаваны рэшткі абарончых збудаванняў старажытнай сцяны пасада. Сцяна ўяўляла сабой вастракол з бярвенняў дыяметрам 0,15–0,2 м, са знешняга боку ад якой на аддаленасці 0,4 м пакладзены лагі дыяметрам 0,2 м. Лагі, верагодна, выкарыстоўваліся як унутрывальная канструкцыя. Дрэва не захавалася, археалагічна зафіксаваны толькі вуголле, рэшткі драўляных валокнаў і карычневая парахня. Рэшткаў вала і рова не зафіксавана, лагі і аснаванне частакола заглыблены ў мацярык на 0,3–0,4 м. Лагі размяшчаліся паралельна сцяне, а сама абарончая сцяна праходзіла ўздоўж Дзвіны на адлегласці 23 м ад абрыва берагавой лініі. Ва ўсходняй частцы раскопа адкрыты рэшткі васьміграннай вежы, якая перакрывала лінію частакола. Яе ніжні вянок заглыблены ў мацярык на 0,1 м, абпаленыя рэшткі бярвенняў фіксаваліся ў культурным пласце на вышыню да 0,25 м. Вежа трапіла ў раскоп напалову, усходняя яе частка выходзіла за межы раскопа.

Можна меркаваць, што вежа мела крыху падоўжаную форму, у вузкай частцы яе шырыня была каля 8 м. Сцены зроблены з бярвенняў даўжынёй 3,6 і 2 м. Паводле стратыграфіі, абарончыя збудаванні адлюстроўваюць пачатковы этап асваення дадзенай тэрыторыі.

Абарончая вежа і вастракол загінулі ў моцным пажары. Найбольш поўна характар канструкцыі плануецца высветліць падчас далейшых раскопак.

Храналогія археалагічных знаходак дазваляе вызначыць час засялення і працягласць існавання заходняй часткі пасада. Паводле археалагічнага матэрыяла, паселенне было заснавана ў X–XI стст. Рэчамі гэтага часу з'яўляюцца калачападобныя



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




*Мал. 1. План Полацка з пазначэннем Запалоцця і тэрыторыі археалагічнага даследавання 2004 г.*

*1 – натуральны роў,*
*2 – натуральны роў,*
*3 – меліярацыйная траншэя,*
*4 – грунтавая дарога*
*–·–·– – тэрыторыя размяшчэння культурнага пласта X -XII стст.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. Кулешова




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*Мал. 2. Вырабы X–XI стст.: 1 – крэсіва, 2 – пацерка, 3 – ключ, 4 – праселка, 5 – наканечнік стралы, 6 – лязо сякеры, 7 – падвеска-сякерка, 8 – фібула, 9 – гузік, 10 – бранзалет, 11 – замок, 12 – шпілька; 1, 3, 5, 6, 12 – жалеза, 2– шкло, 4–гліна, 9– свінец, 7-8, 10,–бронза, 11–жалеза, медзь*




*Мал. 3: 1 – Жалезная пласцінка даспеха, 2 – бронзавая накладка, 3-5 – бронзавыя пярсцёнкі і 6 – бразготка, 7 – шкляны бранзалет, 8 – свінцовая пломба*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

крэсіва з язычком, ключ да навяснога замка тыпу А па ноўгарадскай класіфікацыі Б.А. Колчына, жалезная шпілька з кольцам і шарападобнай галоўкай, бранзалет з зааморфнымі канцамі, шарападобная празрыстая пацерка, глінянае праселка, жалезны наканечнік стралы, свінцовы гузік з прадрапанай выявай знака «IX», бронзавая сякерка-падвеска і фрагмент фібулы (мал. 2). Да гэтай калекцыі, відаць, трэба аднесці ўнікальны артэфакт – замочак мініяцюрных памераў (вышыня 3,5 см) зроблены з жалеза і медзі (мал. 2:11). Замочак не з'яўляўся функцыянальнай рэччу, паколькі адтуліна пад замок у ім адсутнічае, пласціны корпуса і дужка трывала спаяны медзю, а сам замок мае форму лунніцы. Пытанне пра ніжнюю дату існавання помніка патрабуе ўдакладнення, паколькі дыяпазон існавання згаданага комплексу рэчаў ахоплівае як мінімум два стагоддзі: з дзясятага па адзінаццатае.

Другая частка знойдзеных у раскопе рэчаў датуецца XI–XIII стст. Сярод іх упрыгожванні, дэталі адзення, мілітарыі, шыферныя праселкі, рыбалоўныя прылады, нажы і рамесныя інструменты (мал. 3). Адзначым знаходку свінцовай пячаткі з выявай святога (аверс) і расквітнеўшага крыжа (рэверс). З керамікі вылучаюцца 8 фрагментаў амфар.

Большасць пазначаных рэчаў паходзіць з сярэдняга стратыграфічнага гарызонту, верхнюю храналагічную мяжу якога папярэдне можна акрэсліць мяжой XII–XIII стст. Гэтая дата пацвярджаецца наступнымі аргументамі. Па-першае, сярод знаходак адсутнічаюць шкляныя бранзалеты (знойдзены толькі 1 фрагмент у шурфе *4*), іх шырокае бытаванне ў Полацку прыпадае на 20–50-я гг. XIII ст. (Штыхов, 1975, с. 95). Па другое, сярод фрагментаў керамікі раскопа 1 не вылучаны пераходныя формы да познесярэднявечных тыпаў другой паловы XIII–XIV стст. Па-трэцяе, сярэдні стратыграфічны гарызонт – адносна невялікай магутнасці і аднародны па структуры, тады як на Вялікім пасадзе і Верхнім замку напластаванні XIII ст. адны з самых вялікіх і стратыграфічна стракатых.

Такім чынам, падчас раскопак і разведак 2004 г. было вызначана, што ў XI–XII стст. плошча Запалоцкага пасада, а адпаведна і старажытнага Полацка, была большая як мінімум на 21 га, і ў гэтыя часы пасад меў агульную плошчу не менш за 40 га. Вылучаны культурны пласт з матэрыяламі X–XI стст. дазваляе разглядаць Запалоцкі пасад як адно з самых старажытных паселішчаў у тапаграфічнай структуры горада. У X–XI стст., а магчыма і ў XII ст., пасад быў умацаваны драўляным вастраколам, меў абарончыя вежы і размяшчаўся ўздоўж Дзвіны на 1300 м на захад ад вусця Палаты. У XIII ст. адбываецца скарачэнне тапаграфічнай структуры Запалоцкага пасада, ён дасягае сучасных межаў, а заходняя яго частка застаецца па-за межамі гарадской забудовы да нашых дзён.

На сённяшні дзень відавочна неабходнасць працягнення археалагічнага даследавання дадзенай тэрыторыі Запалоцкага пасада. Магчымая прычына, якая прывяла да скарачэння плошчы пасада на пачатку XIII ст., заключаецца ў актыўнай знешняй палітыцы, накіраванай супраць агрэсіі крыжакоў. Верагодна, абараняць заходнюю частку пасада, выцягнутую ўздоўж Дзвіны на значнае аддаленне ад Верхняга замка, да таго ж па накірунку галоўнага ўдара ворага, было цяжка і таму палачане вымушаны былі пакінуць гэтую тэрыторыю. Сляды моцнага пажару, які знішчыў абарончую сцяну, могуць сведчыць аб ваенных дзеяннях.

І апошняе. Вынікі, атрыманыя пасля правядзення раскопак у 2004 г., дазваляюць паставіць пытанне аб дзяржаўнай ахове адкрытага археалагічнага помніка і наданні дадзенай тэрыторыі статуса ахоўнай зоны Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Літаратура**

1. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Полацка. Мн., 2002.
2. **Тарасаў, С.В.** Полацк IX–XVII стст.: гісторыя і тапаграфія. Мн., 1998.
3. **Штыхов, Г.В.** Древний Полоцк IX–XIII вв. Мн., 1975.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова